# АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ ПАЛІТЫКІ ГЕНАЦЫДУ НА ТЭРЫТОРЫІ ПРУЖАНСКАГА РАЁНА Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

**Чаюк Я.С.**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Мікалаева Л.В. – канд. гіст. навук, дацэнт*

Дакдад прысвечаны паказу трагедыі насельніцтва Пружанскага раёна, якое стала ахвярамі палітыкі нацысцкага генацыду ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

За перыяд акупацыі гітлераўцы правялі ў Беларусі больш за 140 карных аперацый, знішчылі больш за 12 тыс. сельскіх населеных пунктаў. Лёс Хатыні, спаленай разам з жыхарамі, падзялілі 618 вёсак, 276 з якіх не былі адноўлены.

Паводле наяўных на сённяшні дзень дадзеных у гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Пружанскага раёна загінула больш за 20 тыс. мірных жыхароў.

Вялікая праца была праведзена па ўсталяванні спаленых вёсак Пружанскага раёна. Да 2021 г. лічылася, што ў гады Вялікай Айчыннай вайны на нашай зямлі было спалена 57 вёсак, шэсць з якіх не былі адноўлены. Гэтыя страшныя лічбы былі аднымі з самых буйных сярод іншых раёнаў рэспублікі. Праведзенай у ходзе расследавання крымінальнай справы працы ўстаноўлена, што ў гады вайны на тэрыторыі раёна (у той час гэта было тры раёны – Пружанскі, Ружанскі і Шарашэўскі) было спалена 134 населеныя пункты, 43 з якіх не былі адноўленыя.

У ліпені 1941 г. у г. Пружаны нямецкімі акупацыйнымі ўладамі было створана яўрэйскае гета. Першапачаткова яно ўключала цэнтральную частку горада, але па меры павелічэння колькасці жыхароў за кошт перасялення яўрэяў з Гайнаўкі, Малой Нарэўкі, Белавежы, Бярозы, Шарашэва, Малеча, межы гета пашыраліся. Да 1943 г. яго ўмоўным цэнтрам стаў рынак на вул. Горына-Каляды.

Колькасць яўрэяў у Пружанскім гета складала больш за 10 тыс.чалавек. Перыядычна іх вывозілі на чыгуначную станцыю Аранчыцы. Лічыцца, што частка яўрэяў была расстраляна ў ваколіцах Пружан, у тым ліку каля в. Слабудка і в. Аранчыцы, а таксама на станцыі Бронная Гара ў Бярозаўскім раёне. Большасць жа апынуліся ў канцлагерах на тэрыторыі Польшчы, Германіі і Аўстрыі, дзе загінулі.

Буйное гета з’явілася ў Ружанах летам 1941 г. у цэнтральную частку пасёлка, абмежаваную калючым дротам і нямецкімі пастамі, сагналі не толькі мясцовых яўрэяў, але і жыхароў Паўлава, Канстанцінава, Косава, Слоніма, Лыскава. Да лістапада 1942 г. яны былі перамешчаныя ў Ваўкавыск і канцлагеры, дзе загінулі. Частка яўрэяў была знішчана ў ваколіцах Ружан і Лыскава. Месцы іх пахаванняў невядомыя.

Для прадстаўлення шырокай грамадскасці вынікаў работы па ўстанаўленні фактаў генацыду беларускага народа ў раёне былі праведзены маладзёжныя дыялогавыя пляцоўкі, сустрэчы з калектывамі, круглыя сталы з прадстаўнікамі прафсаюзных арганізацый, урокі памяці, кніжныя выставы, аўтапрабегі, мітынгі і інш.

***Список использованных источников:***

*1. Вербицкий, А. М. О геноциде белорусского народа / А. М. вербицкий [Электронный ресурс]. − Режим доступа : http://pruzhany.brest-region.gov.by/ru/info-ru/view/o-genotside-belorusskogo-naroda-2000003020. – Дата доступа : 20.03.2024.*

*2. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Пружанскага раёна / Беларуская энцыклапедыя. – Мінск : БелЭн, 1992. – 449, [5] с. : іл.*